WWW.ZVIAZDA.BY — на 12 гадзін раней

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

1 ЛІПЕНЯ 2010 г.
ЧАЦВЕР
№ 126
(26734)

Кошт 650 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.

«Прамая лінія»

## САМААДЧУВАННЕ НЕ ВЫДАТНАЕ?

Не адкладвайце на заўтра вырашэнне праблем, звязаных са здароўем. Удакладняйце незразумелае, не займайцеся самалячэннем, калі да справы можна падысці прафесійна. А на дапамогу вам гатова прыйсці **дацэнт кафедры геранталогіі і герыятрыі Беларускай медыцынскай акадэміі паслядыпломнай адукацыі, кандыдат медыцынскіх навук Любоў Пятроўна ВАРОНІНА.** Яна адкажа на любыя вашы пытанні **СЁННЯ з 14.00 да 15.30 па нумарах: 8 (017) 292 38 21 і 292 38 92. Папярэднія пытанні можна пакінуць па нумарах: 8 (017) 287 18 36 і 287 18 29.**

«Прамая лінія»

## ШТО ЎВАХОДЗІЦЬ У ТЭХНІЧНАЕ АБСЛУГОЎВАННЕ ДОМА? ХТО ПАВІНЕН РАМАНТАВАЦЬ ДАХ? КУДЫ ЗВЯРТАЦЦА, КАЛІ ЖЭУ НЕ РЭАГУЕ НА СКАРГІ?

На ўсе вашы пытанні па працы жыллёва-эксплуатацыйных упраўленняў нашай краіны адкажуць спецыялісты Міністэрства ЖКГ: **начальнік упраўлення жыллёвай гаспадаркі Эдмунд Іосіфавіч ГРЫШКЕВІЧ і начальнік упраўлення эканомікі Алена Іванаўна ДУДЗІНСКАЯ.**

**12 ліпеня з 16.00 да 17.30 задавайце пытанні па нумарах 8 (017) 292 38 21 і 8 (017) 287 18 29. Пытанні можна пакінуць і загадзя па тэлефоне 8 (017) 287 18 64.**

Аляксандр ЛУКАШЭНКА:

## «ВЫПУСКНІКІ ВНУ ПАВІННЫ СТАЦЬ КАТАЛІЗАТАРАМ ДЗЕЛАВОЙ І ТВОРЧАЙ АКТЫЎНАСЦІ Ў ЛЮБОЙ СПРАВЕ»



Фота БЕЛТА.

**Дзяржава пры вызначэнні шляхоў свайго развіцця робіць стаўку на моладзь. Аб гэтым заявіў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка, выступаючы 29 чэрвеня на Рэспубліканскім балі выпускнікоў вышэйшых навучальных устаноў. Удзел у мерапрыемстве прынялі 270 лепшых выпускнікоў беларускіх ВНУ.**

Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што маладыя людзі завяршылі важны этап у сваім жыцці, падышлі да новага рубяжа, за якім пачынаецца зусім іншае, дарослае жыццё. Цяпер з кожным днём на іх будзе ўскладацца ўсё больш адказнасці — за выбар свайго месца ў жыцці, за сваіх блізкіх, сям'ю і, нарэшце, за нашу краіну. Аляксандр Лукашэнка пажадаў, каб моладзь заўсёды была на вышыні і апраўдвала гэты давер.

Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што хочацца бачыць маладых людзей сапраўднымі патрыётамі, якія шчыра любяць Беларусь. Пры гэтым Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што нам ёсць чым ганарыцца — багатай гісторыяй і культурай Беларусі, яе цяперашнімі дасягненнямі і грандыёзнымі планамі.

Ён таксама сказаў, што атрыманне незалежнасці азнаменавала нараджэнне новай, суверэннай Беларусі, маючай стратэгічныя перавагі, якія неабходна ў поўнай меры рэалізаваць. «Сёння мы — маладая дзяржава, у якой наперадзе каласальныя перспектывы, і ўсе яны звязаны з моладдзю», — падкрэсліў Прэзідэнт.

«Беларусь развіваецца, нягледзячы на крызісы і знешнія пагрозы, — заявіў Аляксандр Лукашэнка. — Таму тым, хто робіць стаўку на эміграцыю або праціўдзеянне сваёй краіне і свайму народу, рана ці позна будуць у пройгрышы, паколькі лепшы спосаб стаць грамадзянінам багатай і квітнеючай дзяржавы — гэта стварыць яе самому».

СТАР. 2

Прыёмная кампанія-2010

## ЭКЗАМЕНАЦЫЙНЫЯ ХВАЛЯВАННІ — У МІНУЛЫМ...

### ...галоўнае цяпер — дачакацца вынікаў ЦТ

**УЧОРА цэнтралізаванае тэсціраванне выйшла на фінішную прамую. Апошнімі ў экзаменацыйныя аўдыторыі прыйшлі ўдзельнікі цэнтралізаванага тэсціравання па хіміі. У Беларускім дзяржаўным педагагічным універсітэце, які разам з прадстаўнікамі Камітэта дзяржаўнага кантролю наведала група журналістаў, ужо не адчувалася таго напружання, якое літаральна луна-ла ў паветры два тыдні таму, калі абітурыенты ішлі на свой першы іспыт.**

— Механізм правядзення цэнтралізаванага тэсціравання добра адладжаны і зразумелы абсалютна ўсім, пра што сведчыць адсутнасць скаргаў ад абітурыентаў і іх бацькоў у дзяржаўную камісію, — паведаміла журналістам **начальнік галоўнага ўпраўлення кантролю за работай галін сацыяльнай сферы Камітэта дзяржаўнага кантролю, кіраўнік міжведамаснай рабочай групы Дзяржаўнай камісіі па кантролі за ходам правядзення ўступных іспытаў Ала МІКАЛУЦКАЯ.** — Асобныя звароты ў дзяржкамісію мелі пераважна ўдакладняльны характар: ці можна прайсці ў пункт тэсціравання па ксеракопіі пашпарта, як зарэгістравацца для здачы тэсціравання ў рэзервовы дзень і г. д. Увогуле ўступная кампанія была арганізаваная ў гэтым годзе на самым высокім узроўні. Добра спрацавалі ўсе: і работнікі дзяржаўнай камісіі па кантролі за ходам падрыхтоўкі і правядзеннем уступных іспытаў, і прадстаўнікі Камітэта дзяржаўнага кантролю, і прадстаўнікі навучальных устаноў. Між іншым, да кантролю за правядзеннем уступнай кампаніі па ўсёй краіне было прыцягнута больш за 130 работнікаў Камітэта дзяржаўнага кантролю. А ўсяго па краіне былі задзейнічаны каля трох тысяч экзаменацыйных аўдыторый.



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Ала Мікалуцкая з задавальненнем адзначыла, што колькасць парушальнікаў правілаў удзелу ў цэнтралізаваным тэсціраванні з кожным годам змяншаецца. Так, на ўсіх тэставых іспытах (за выключэннем тэсціравання па хіміі — на момант падрыхтоўкі матэрыялу інфармацыі па гэтым прадмеце яшчэ не было) ад удзелу ў тэсціраванні былі адхіленыя 38 чалавек. 25 чалавек пазбавіліся магчымасці ўдзельнічаць у прыёмнай кампаніі з-за свайго нежадання расставацца з мабільным тэлефонам, хоць папярэджанні аб тым, што мабільнік з'яўляецца прадметам забароненым, экзаменацыйнай аўдыторыі гучаць пастаянна: і пры ўваходзе ў вучэбны корпус, і пры ўваходзе ў экзаменацыйную аўдыторыю, і перад самым пачаткам экзамену.

СТАР. 3

## У ВАРНЯНСКІМ КАСЦЁЛЕ ЗНАЙШЛІ ФРЭСКУ XVIII СТАГОДДЗЯ!

*На ёй выяўлены малады ксёндз. Адмыслоўцы лічаць, што касцёл Святога Юрыя хавае і іншыя тайны*







Фота аўтара і Алеся ЮРКОЙЦЯ.

**ВАРНЯНЫ — мястэчка на Астравеччыне. У цэнтры — касцёл Святога Юрыя, асвечаны ў 1769 годзе. Учора ў «Звязду» паведамілі: у час рамонту ў закрыстыі знойдзена ўнікальная фрэска!**

— Ксёндз-пробашч Здзіслаў Пікула распачаў рамонт, наняў на працу тутэйшага чалавека, з Варнянаў. Адбіў тынкоўкі мо на які палец добры — і адкрылася фрэска з выявай ксяндза! — распавядае краязнаўца Алесь ЮРКОЙЦЬ. — Роспіс знаходзіцца ў бакавой прыбудове, у адной з закрыстый, з паўднёвага боку. Наш пробашч мяркуе, што гэта Станіслаў Костка (1550—1568, манах ордэна езуітаў, каталіцкі святы — **Г.Л.**). Але наўрад ці гэта так, таму што няма ніякіх пазнакаў, што гэта — святы, а яны павінны быць. Тут, хутчэй за ўсё, мае рацыю мастацтвазнаўца Сяргей Харэўскі, які мяркуе, што гэта мог быць намаляваны наш варнянскі пробашч. Верагодна, што гэта роспіс канца XVIII — пачатку XIX стагоддзя. Бо наш касцёл быў збудаваны ў XVIII стагоддзі, але ён два разы дабудоўваўся. І сама закрыстыя, як я мяркую, была прыбудаваная якраз у пачатку XIX стагоддзя. Мы вельмі спадзяёмся, што на нашу фрэску звернуць увагу спецыялісты — у прыватнасці, славуты мастак-рэстаўратар Уладзімір Ракіцкі...

СТАР. 4

Як нас дураць

## КУПІЛІСЯ НА «ПРЫМАЛЬНУЮ ЦАНУ»

**25- і 28-гадовыя прайдзісветы падманулі сваіх кліентаў, якія «клюнулі» на танную прадукцыю, на больш як 35 мільёнаў рублёў**

А напачатку, паводле звестак прэс-афіцэра Заводскага РУУС Тамары Рулінскай, двое непрацуючых жыхароў Маладзечанскага раёна, каб зручней было выманьваць грошы, арганізавалі фірму. Прычым тут таксама не абышлося без хітрасці: зарэгістраваная яна была на жыхара Мінскай вобласці, пашпарт якога лічыўся непрыдатным у Уздзенскім РАУС, а ўладальнік дакумента даведаўся, што ён «фірмач», толькі ад супрацоўнікаў міліцыі.

У далейшым, каб пабагацець, двое «бізнэсменаў» таксама асабліва не перапрацаваліся. Праз інтэрнэт кампаньёны разаслалі ў розныя будаўнічыя арганізацыі краіны прапановы на пастаўку металапрадукцыі — профільных труб, металічных вугалкоў, металапрофілю і г.д. А галоўнае — выставілі прымальную цану, каб кліент «папёр». Акрамя таго, умовай пастаўкі зрабілі стапрацэнтную перадаплату. Зразумела, што ахвотнікі знайшліся. Апошнім аферысты прапаноўвалі па факсе заключыць адпаведны дагавор, а грошы неабходна было пераводзіць на электронны разліковы рахунак, які папярэдне быў адкрыты ў адным з буйных банкаў. За непрацяглы час ахвярамі прайдзісветаў сталі шэсць будаўнічых арганізацый, якія пералічылі на рахунак фірмы больш за 35 мільёнаў рублёў. Між іншым, на большую частку гэтых грошай кампаньёны набылі 14 ноўтбукаў, пасля чаго зламыснікі зніклі.

Пасля таго, як адна з падманутых будаўнічых кампаній звярнулася па дапамогу да праваахоўнікаў, апошнім удалося ўстанавіць асобы аферыстаў. Як выявілася, адзін з іх раней нават працаваў у сталічнай будаўнічай фірме, дзе займаўся непасрэдна пастаўкамі металапрадукцыі. А затрымалі хітруноў толькі пасля таго, як яны адпачылі ў Італіі: аднаго адразу пасля вяртання на радзіму, а другі нейкі час хаваўся ад следства, аднак нарэшце прыйшоў з павіннай у міліцыю. Дарэчы, праваахоўнікамі былі канфіскаваныя ноўтбукі, якія зламыснікі купілі на вымантачаныя грошы.

**Ігар ГРЫШЫН.**

## 455 ТОН СЕНА ЗНІШЧАНА Ў ВЫНІКУ ПАДПАЛУ

**ў КСУП «Ураджайны» вёскі Убарок Лоеўскага раёна. Пажар пачаўся прыкладна ў дзве гадзіны ночы.**



Калі на месца здарэння прыбыла дзяжурная змена пажарнага аварыйна-выратавальнага паста гэтага ж населенага пункта, ужо гарэлі 2 навесы памерамі 12x50 метраў і 1 — 12x40 метраў з шыферным дахам. Для тушэння пажару былі прыцягнуты сілы Лоеўскага і Рэчыцкага раённых аддзелаў па надзвычайных сітуацыях, у баявы разлік уведзена рэзервовая тэхніка. Сена тушылі з дапамогай 5 аўтацыстэрнаў, рукаўнага аўтамабіля і перасоўнай помпавай станцыі, прыцягваліся чатыры машыны і 25 супрацоўнікаў гаспадаркі «Ураджайны». Полымя не маглі ўтаймаваць на працягу амаль дзвюх гадзін. У выніку тры навесы з кормам для жывёлы дасталіся чырвонаму пеўню. Мяркуецца, што хтосьці паклапаціўся пра тое, каб пазбавіць КСУП запасаў сена.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

## НАФТА САЛІДАРНАСЦІ

*Венесуэла разглядае пастаўкі ў Беларусь як жэст падтрымкі, да таго ж і рэнтабельны*

На фоне ўсёй гэтай газа-нафтавай неразбярыхі, якая апанавала стужкі навінаў і свядомасць абывацеляў, усё, што ўтрымлівае нават намёк на альтэрнатыву, прыкоўвае ўвагу. А супрацоўніцтва з Венесуэлай у гэтай галіне — ужо не проста тонкая алюзія, а прамое ўказанне на дыверсіфікацыю.

— Летась узнікала пытанне, ці будзе магчымая пастаўка нафты з Венесуэлы ў Беларусь, а сёлета ўзнікае пытанне, ці рэнтабельны гэты бізнэс, — адзначае **пасол Венесуэлы ў Беларусі Амерыка ДЗІЯС НУНЬЕС** падчас сустрэчы з журналістамі. — Адказ відавочны: калі б гэта было нерэнтабельна, пастаўкі не здзяйсняліся б.

Канкрэтны ж кошт ён дыпламатычна замоўчвае, гэтую інфармацыю пасол аднёс да тых «камерцыйных тайнаў, якія ў далейшым становяцца яўнымі» (маўляў, захоўвайце спакой і цярпенне).

Дыпламат падкрэсліў, што падобныя стратэгічныя пагадненні заключаюцца на ўзроўні кіраўнікоў дзяржаў. Такія ж пагадненні ў Венесуэлы ёсць і з іншымі краінамі — «на льготных умовах».

— Гэта жэст салідарнасці, падтрымкі беларускаму народу, — кажа кіраўнік дыпмісіі.

Ён робіць акцэнт на стабільнасці гэтых адносінаў: планы налета распасціраюцца да яшчэ большых аб'ёмаў паставак — 10 млн тон. Пры гэтым дзеянні Венесуэлы, паводле яго слоў, «не з'яўляюцца дзеяннямі манаполіі, якая хацела б навязаць свае цэны».

— Гэта пытанне даверу, мы не хочам рабіць ніякіх спекуляцый па гэтым пытанні.

СТАР. 3

Услед за пісьмом

## ВАКОЛ МІНСКА ЗЯМЕЛЬНЫ ПАДАТАК ПАВЯЛІЧЫЦЦА. КАНЧАТКОВЫЯ ЛІЧБЫ ПАКУЛЬ НЕВЯДОМЫЯ

**ДНЯМІ рэдакцыя нашай газеты атрымала ліст ад жыхароў Мінскага раёна, вёскі Новы Двор, якія жывуць па вуліцы Цэнтральнай. Спадарыня ШЫМАНСКАЯ ад групы аднавяскоўцаў паведамляе, што, калі яны паспрабавалі заплаціць падатак на зямлю, то даведаліся пра павелічэнне зямельнага падатку больш чым у 30 разоў. За 9—10 сотак зямлі з іх патрабуюць зямельны падатак у памеры каля 350 тысяч рублёў...**

Аўтар ліста спадарыня Шыманская спасылаецца на артыкул у «Звяздзе» ад 3 красавіка 2010 года: «У прэстыжным прысталічным рэгіёне зямельны падатак павялічылі прыкладна ў 10 разоў», дзе на пытанні карэспандэнта адказвае **начальнік інспекцыі Міністэрства па падатках і зборах Беларусі па Мінскім раёне Тэрэса РЭУТАВА.**

У нашай чытачкі і жыхароў вёскі Новы Двор узнікае пытанне: як моцна павялічылі падатак на іх землі і чаму? Калі падаткавікі ўпэўнены, што «ўладальнікі дарагіх катэджаў маюць нядрэнныя заробкі і змогуць адшукаць каля 200 тысяч рублёў, каб разлічыцца за зямельны ўчастак», то нагадаю, што нашы дамы па вуліцы Цэнтральнай былі пабудаваныя ў перыяд 1957—1959 гадоў, там жывуць звычайныя грамадзяне, якія не маюць звышдаходаў, і новы вялікі зямельны падатак для нас непасільны, — удакладняе сітуацыю спадарыня Шыманская. Усяго пад пісьмом сп. Шыманскай 17 подпісаў жыхароў вёскі Новы Двор.

Сапраўды, сёлета кардынальна змяніўся механізм налічэння зямельнага падатку, які цяпер ужо напрамую залежыць ад кадастравага кошту занятай зямлі. Разам з тым, **начальнік аддзела падаткаабкладання фізічных асобаў падатковай інспекцыі па Мінскім раёне Валерый ЧАРНЕЎСКІ,** да якога мы звярнуліся па каментарый, паведаміў, што цяпер часова прыпынена налічэнне і падлік зямельных падаткаў для фізічных асобаў, мясцовыя сельсаветы не налічвалі ніякіх маёмасных падаткаў, падатковыя паведамленні нікому не ўручаліся. З якога дакумента ўзялася сума падатку ў памеры 350 тысяч рублёў, В. Чарнеўскаму невядома.

У падатковай інспекцыі рэдакцыі паведамілі, што падрыхтаваны адпаведны праект указа кіраўніка дзяржавы, дзе падразумяваецца крыху іншая методыка налічэння зямельнага падатку, а ў выніку і сумы падатку стануць іншымі. Мяркуецца, што для пэўных катэгорый насельніцтва і асобных тэрыторый сумы падатку зменшацца.

Акрамя гэтага, Валерый Чарнеўскі паведаміў, што дзейным заканадаўствам прадугледжаны шэраг ільгот па аплаце зямельнага падатку для пенсіянераў, тых, хто жыве ў сельскай мясцовасці і працуе на сельскагаспадарчых прадпрыемствах або ў сферах адукацыі ці аховы здароўя і г.д. Тут трэба нагадаць, што мясцовыя ўлады маюць права самастойна змяншаць ці павялічваць стаўку зямельнага падатку ў два разы.

Да ведама, жыхары Мінскага раёна атрымаюць падатковыя паведамленні аб зямельным падатку да першага жніўня, а разлічыцца па гэтых плацяжах трэба будзе да 15 лістапада. Рэдакцыя «Звязды» будзе і надалей сачыць за развіццём зямельнай сітуацыі.

**Сяргей КУРКАЧ.**

## НЕСПРЫЯЛЬНЫЯ ДНІ І ГАДЗІНЫ Ў ЛІПЕНІ

| | |
|---|---|
| 3, субота, 10.00—13.00 | 16, пятніца, 12.30—13.30 |
| 5, панядзелак, 20.25—24.00 | 18, нядзеля, 13.30—16.30 |
| 8, чацвер, 5.00—8.00 | 23, пятніца, 4.00—7.30 |
| 10, субота, 9.00—10.30 | 25, нядзеля, 13.30—18.30 |
| 12, панядзелак, 11.00—13.00 | 28, серада, 2.30—7.00 |
| 14, серада, 9.30—12.30 | 30, пятніца, 2.30—19.30 |

## У Буда-Кашалёўскім раёне на штучным вадасховішчы патанула 8-гадовая дзяўчынка

**На штучным вадасховішчы ў вёсцы Нікалаеўка Буда-Кашалёўскага раёна вечарам 29 чэрвеня патанула 8-гадовая дзяўчынка, вучаніца мясцовай сярэдняй агульнаадукацыйнай школы. Пра гэта БЕЛТА паведамілі ў прэсслужбе УУС Гомельскага аблвыканкама.**

З вады патанулую выцягнулі мясцовыя жыхары. Труп дастаўлены ў морг. У цяперашні час высвятляюцца падрабязнасці трагедыі.

Як адзначылі ў Гомельскай арганізацыі РГОО «Беларускае рэспубліканскае таварыства выратавання на водах», НЗ у Нікалаеўцы -- першы няшчасны выпадак, які адбыўся з дзецьмі на тэрыторыі Гомельскай вобласці ў гэтым купальным сезоне. Усяго, паводле аператыўных даных на 28 чэрвеня, у рэгіёне патанулі 57 чалавек, што амаль на 10 чалавек больш, чым за той жа перыяд годам раней.

## ЯКАСНЫЯ ЗАКОНЫ — АСНОВА ПАСКОРАНАГА РАЗВІЦЦЯ ГРАМАДСТВА

*Выступленне Старшыні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь РУБІНАВА А.М. на закрыцці чацвёртай сесіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь чацвёртага склікання*



Фота БЕЛТА.

Паважаныя члены Савета Рэспублікі!

Паважаныя запрошаныя і журналісты!

Сёння мы завяршаем работу чацвёртай сесіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь чацвёртага склікання. Характар яе работы ў значнай меры быў вызначаны Пасланнем Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь беларускаму народу і Нацыянальнаму сходу. Кіраўнік дзяржавы намеціў галоўныя кірункі развіцця нашай краіны, якія павінны забяспечыць якасны прарыў у яе далейшым сацыяльна-эканамічным развіцці. Базісам у рашэнні пастаўленай задачы стануць лібералізацыя эканомікі, інавацыі, дзелавая ініцыятыва, развіццё прадпрымальніцтва і сацыяльная адказнасць. Па сутнасці, новыя працэсы і новыя адносіны ўвойдуць ва ўсе сферы нашага жыцця. Таму прыярытэтнай задачай Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь і ўсіх іншых суб'ектаў нарматворчай дзейнасці з'яўляецца распрацоўка такіх заканадаўчых актаў, якія забяспечвалі б прававую аснову для рэалізацыі сфармуляваных задач. На дасягненне гэтых мэтаў і была накіравана дзейнасць Савета Рэспублікі.

Ад сесіі да сесіі мы ўдасканальваем падыходы да распрацоўкі і падрыхтоўкі нарматыўных прававых актаў, якія склаліся і апрабаваныя практыкай. Яшчэ на стадыі «зараджэння» законапраекта члены Савета Рэспублікі і спецыялісты Сакратарыята Савета Рэспублікі актыўна падключаюцца да дзейнасці рабочых груп, удзельнічаюць у семінарах, нарадах, канферэнцыях, на якіх прапрацоўваюцца і ўзгадняюцца розныя меркаванні. Падобная практыка існуе на ўсіх этапах праходжання законапраекта. Гэта дазваляе значна паскорыць заканатворчы працэс, забяспечыць высокую якасць падрыхтоўкі законапраектаў і зрабіць заканадаўчыя акты больш даступнымі і зразумелымі для грамадзян.

Чацвёртая сесія была дастаткова насычанай з пункта гледжання заканатворчай дзейнасці. Савет Рэспублікі ўхваліў каля 60-ці законапраектаў і прыняў да ведама 5 дэкрэтаў Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Большасць з іх мае жыццёва важнае значэнне для нашага грамадства. Перш за ўсё, трэба адзначыць законы, якія фарміруюць прававыя асновы якасна новых кірункаў развіцця нашай эканомікі. Так, Закон Рэспублікі Беларусь «Аб падтрымцы малога і сярэдняга прадпрымальніцтва» закліканы забяспечыць развіццё прыватнага бізнэсу і аздараўленне эканомікі ў цэлым.

СТАР. 2

## АД ЯКАСЦІ ЗАКОНАЎ ДА ЯКАСЦІ ЖЫЦЦЯ

*Выступленне Старшыні Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь АНДРЭЙЧАНКІ У.П. на закрыцці чацвёртай сесіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь чацвёртага склікання*



Фота БЕЛТА.

Паважаныя дэпутаты, запрошаныя і журналісты!

Завяршае работу чацвёртая сесія Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь чацвёртага склікання.

Ацэньваючы яе вынікі, неабходна прызнаць, што дэпутатамі праведзена значная работа. Разгледжана звыш ста пытанняў, якія ў той ці іншай ступені закранаюць практычна ўсе аспекты нашай дзейнасці.

Цэнтральнае месца ў рабоце парламентарыяў заняла рэалізацыя задач, пастаўленых кіраўніком дзяржавы ў Пасланні беларускаму народу і Парламенту. У сувязі з гэтым прыярытэтная ўвага ўдзялялася пытанням павышэння якасці заканадаўства і яго эфектыўнасці.

Заканамерна, што асноўным блокам парадку дня стала эканамічная праблематыка, уключаючы заканадаўчае забеспячэнне развіцця дзелавой ініцыятывы, інвестыцыйнай і інавацыйнай дзейнасці.

Так, пазітыўную ролю ў паляпшэнні дзелавога клімату прызначаны адыграць Закон «Аб падтрымцы малога і сярэдняга прадпрымальніцтва». Яго прыняцце сведчыць аб імкненні дзяржавы садзейнічаць развіццю прадпрымальніцкай ініцыятывы грамадзян, у тым ліку за кошт пашырэння доступу да крэдытных рэсурсаў, больш актыўнага прыцягнення да ўдзелу ў дзяржаўных закупках, а таксама спрашчэння бухгалтарскай і статыстычнай справаздачнасці.

У гэтым жа ключы павінны працаваць змяненні ў заканадаўстве, накіраваныя на пашырэнне прыватызацыйнага поля і ўдакладненне спосабаў прыватызацыі дзяржаўнай маёмасці. Папраўкі, унесеныя ў Закон «Аб гаспадарчых таварыствах», дадуць магчымасць умацаваць прававы статус і зрабіць больш празрыстымі правілы дзейнасці гэтай групы суб'ектаў гаспадарання.

Асабліва падкрэслю важнасць рашэнняў па падтрымцы інавацыйнай актыўнасці. Змяненні, унесеныя ў законы, якія рэгулююць сферу навуковай дзейнасці, арыентаваны на ўкараненне сучасных метадаў кіравання, павышэнне зацікаўленасці вучоных і вынаходнікаў у выніках сваёй працы. У гэтым плане трэба адзначыць і праект Закона «Аб аўтарскім праве і сумежных правах».

Перспектыўнай сферай для інавацый з'яўляецца альтэрнатыўная энергетыка. Між тым у нашай нарматыўнай базе адсутнічаюць дзейсныя стымулы і гарантыі для яе развіцця. Устараніць гэты прабел павінен законапраект «Аб аднаўляльных крыніцах энергіі».

Зразумела, дзяржаўная падтрымка гаспадарчай дзейнасці апраўдана толькі ў тым выпадку, калі на выхадзе мы атрымаем канкурэнтаздольны прадукт.

СТАР. 2

ISSN 1990 - 763X

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 1.07.2010 г. (для б/н разлікаў)

| | |
|---|---|
| ▲ 1 долар ЗША ............ 3 020,00 | 1 чэшская крона .......... 143,16 |
| ▲ 1 еўра ............ 3 690,74 | 1 польскі злоты .......... 890,29 |
| 1 латвійскі лат .......... 5 208,69 | ▼ 1 расійскі рубель .......... 96,62 |
| 1 літоўскі літ .......... 1 069,52 | 1 украінская грыўня .... 381,99 |

Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў Цэнтрабанк РФ

| | |
|---|---|
| USD | 31,2554 |
| 10 UAH | 39,4569 |
| 1000 BYR | 10,3529 |
| EUR | 38,2097 |

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

Краіна здароўя
Выпуск № 30 (199)




Фота БЕЛТА.

Карысныя парады

# ПАСЛЯ ВОДПУСКУ — ТРЫ ДНІ НА РАЗВАРУШВАННЕ

**У ПСІХОЛАГАЎ і псіхатэрапеўтаў ёсць прымаўка: нікому так не патрэбен адпачынак, як таму, хто толькі што з яго вярнуўся. Увогуле, калі ў першы працоўны дзень вы ідзяце на службу з нудой на душы, бубнячы сабе пад нос: «Лепш бы я зусім не адпачываў», і калі за справы жах як не хочацца брацца, а пры выглядзе калег хіліць на сон — значыць, у вас стапрацэнтная пасляадпускная дэпрэсія (альбо пасляадпускны сіндром).**

Хоць «пасляадпускная дэпрэсія» — не медыцынскі тэрмін, такія станы не бяскрыўдныя, і трэба разумець, з чым яны звязаныя. Характэрныя дыскамфортныя адчуванні — калі на першы план выходзяць сум, дрэнны настрой, раздражняльнасць, няўважлівасць, слабасць, нават парушэнні сну — могуць доўжыцца пасля водпуску да 10 дзён. Часам далучаюцца і фізічныя сімптомы — галаўны боль, пад'ём ціску, прастуды.

**Якія ж асноўныя прычыны пасляадпускнога сіндрому?**

**1.** «Няправільная» працягласць водпуску. Вучоныя вызначылі, што мінімальны тэрмін водпуску — два тыдні, норма — тры. Паколькі тыдзень арганізму патрэбен, каб адаптавацца да новага клімату, гадзіннага поясу або роду дзейнасці — безрабоцця. Яшчэ тыдзень — для непасрэднага адпачынку і некалькі дзён для рэакліматызацыі — зваротнай адаптацыі да ранейшых умоў жыцця. У гэты перыяд арганізм у поўнай збянтэжанасці: ён толькі паспеў прыстасавацца да новых умоў, як яго раптам вяртаюць да ранейшых. Наступае дэзарыентацыя ў часе і прасторы, псіхалагічны і фізіялагічны стрэс, які змяняецца дэпрэсіяй.

**2.** Збой біялагічных рытмаў. Сутачны біярытм — самы складаны і індывідуальны. Асабліва цяжка тым, у каго ўласны сутачны біярытм не супадае з рабочым. Класічны прыклад: чалавек-«сава», які на адпачынку спаў да паўдня ў сваё задавальненне, вымушаны зноў уставаць на працу ў 7 раніцы. Вельмі цяжка «ламаць» сябе, тым больш, калі чалавек яшчэ вельмі расслаблены пасля адпачынку і не можа мабілізавацца.

**3.** Яшчэ адна распаўсюджаная памылка — адпачываць «за кампанію». Адзін, паддаўшыся на ўгаворы сяброў, едзе з імі ў горы, хоць любіць паляжаць на пляжы; другі ўвесь водпуск дзеля жонкі і дзяцей парыцца на поўдні, хоць на дух не пераносіць спякоту. Насамрэч адпачынак гэтаксама індывідуальны, як і працоўны рытм чалавека. Таму, каб водпуск вас не расчараваў, трэба ў самым яго пачатку падумаць, што неабходна менавіта вам для добрага адпачынку?

**4.** Вельмі моцны кантраст паміж летнім райскім жыццём і звышнапружаннем на працы прыводзіць да таго, што з'яўляецца страх не ўвайсці ў звыклыя абставіны, не справіцца са справамі, якія назапасіліся.

**Каб правільна «выйсці» з водпуску, прытрымлівайцеся наступных рэкамендацый псіхолагаў:**

- Не плануйце ў дзень прыезду ніякіх сур'ёзных сустрэч і візітаў.
- Вяртайцеся з водпуску мінімум за 2—3 дні да пачатку працы.
- Не спяшайцеся тэлефанаваць знаёмым і сябрам, каб даведацца ўсе навіны, — звычайна добрых вестак менш, чым дрэнных.
- Пачынайце дзень са спакойнага планавання ўсіх спраў.
- Кожную гадзіну рабіце 10-хвілінны перапынак, але не перакур.
- Не затрымлівайцеся на працы першыя 2—5 дзён, пастарайцеся пайсці раней.
- Не паглыбляйцеся з галавой ва ўсе справы, якія назапасіліся за гэты час.
- Умейце сказаць сабе: «Усё, на сёння хопіць».
- Не падыходзьце да камп'ютара дома, калі працуеце за ім у офісе.
- Не злуйцеся на кіраўніка і супрацоўнікаў за іх неадэкватныя паводзіны, магчыма, ім таксама няпроста пасля водпуску. Станьце самі цэнтрам добрага настрою.
- Не пачынайце адразу новых маштабных праектаў, лепш яшчэ раз уважліва прааналізуйце перспектывы арганізацыі і свае асабістыя планы.
- У дзень прыезду дамоў добра выспіцеся і адпачніце.
- Гуляйце перад сном, асабліва, калі працуеце ў памяшканні.
- Спіце больш — мінімум 7 гадзін, а лепш столькі, колькі хочацца.
- Прымайце комплекс вітамінаў і прэпаратаў для ўмацавання імуннай сістэмы.
- Не мяняйце рэзка рацыён харчавання.
- Не ешце шмат у абедзенны перапынак; не трымайцеся выразу: «Усё жыццё — барацьба: да абеду з галадам, пасля абеду са сном».
- Ешце бананы, шакалад, сыр, якія ўтрымліваюць прыродныя антыдэпрэсанты.
- Часцей гуляйце днём — сонца зараджае нас энергіяй.
- У першыя дні пасля водпуску пастарайцеся пазбягаць канфліктных сітуацый і дома, і на працы.
- Фізкультура — крыніца мышачнага задавальнення: карысныя хуткая хада, веласіпед, бег трушком, танцы.
- Яшчэ адна хітрасць — уставайце раніцай хвілін на 20—30 раней, чым звычайна. Гэта дасць вам дадатковы час на пераасэнсаванне каштоўнасцяў, прывыканне да новых абставін і на мары пра наступны водпуск.

**Падрыхтавала Вольга ЦЫБУЛЬСКАЯ.**

Здароўе на талерцы

# АБАРОНА СОІ

**Строга кажучы, гэтаму цудоўнаму прадукту абарона не патрэбная. Проста з нядаўніх часоў у свеце ідзе сапраўдны соевы бум. А ў кожнай новай ідэі і тэндэнцыі абавязкова з'яўляюцца як прыхільнікі, так і праціўнікі. Вучоныя спрачаюцца аб карысці і шкодзе соі і соевых прадуктаў і выказваюць дыяметральна супрацьлеглыя думкі. А можа прычына ў тым, што на рынку шмат соі генетычна мадыфікаванай? Соя павінна быць натуральнай, а не ГМА, для таго каб быць упэўненымі ў яе бясшкоднасці.**

**ШТО Ў ЁЙ ДОБРАГА?**

**Бялкі,** якія практычна не саступаюць па пажыўнасці і харчовай каштоўнасці бялкам жывёльнага паходжання.

**Алей,** багаты на поліненасычаныя тлустыя кіслоты, фосфаліпіды, карысныя для печані і пры дыябеце. Такаферолы, якія ўтрымліваюцца ў соевым алеі, павышаюць імунітэт, замаруджваюць працэс старэння.

**Вугляводы** — глюкоза, фруктоза, цукроза, а таксама крухмал, пекцінавыя рэчывы.

**Вітаміны** E, $B_6$, $B_1$, $B_2$, $B_3$, PP, бэта-карацін.

**Макраэлементы:** калій, фосфар, кальцый, магній, сера, крэмній, хлор, натрый.

**Мікраэлементы:** жалеза, марганец, бор, алюміній, медзь, нікель, малібдэн, кобальт, ёд.

**У ЧЫМ КАРЫСЦЬ?**

- Аказвае актыўнае ліпатропнае дзеянне (паніжае назапашванне тлушчаў у печані), рэгулюе тлушчавы абмен.
- Валодае жаўцягоннай уласцівасцю.
- З'яўляецца крыніцай харчовай дыетычнай клятчаткі.
- Рэкамендуецца пры харчовай алергіі на жывёльныя бялкі і, у прыватнасці, непераноснасці малака.
- Дыетатэрапеўтычны сродак для дыябетыкаў.
- Рэкамендуецца пры сардэчна-сасудзістых захворваннях.
- Аднаўляе гарманальную раўнавагу ў арганізме, дзякуючы ізафлавонам (рэчывы, якія па сваім уздзеянні на арганізм падобныя на жаночыя гармоны — эстрагены). Яны дабратворна ўплываюць на арганізм жанчыны: змяншаюць рызыку захворвання на рак грудзей, палягчаюць дыскамфорт у перыяд клімаксу, умацоўваюць касцявую тканку.

**ДЫК ЕСЦІ ЦІ НЕ?**

Есці, але, вядома ж, — у меру. Супрацьпаказаннем да ўжывання соі з'яўляецца індывідуальная непераноснасць. Зазначым таксама, што некаторыя вучоныя лічаць: ужыванне соі і соевых прадуктаў лепш абмежаваць пры цяжарнасці (па прычыне высокага ўтрымання гармонападобных злучэнняў) і дзецям (ізафлавоны соі аказваюць прыгнятальнае дзеянне на іх эндакрынную сістэму).

**Падрыхтавала Вольга ЦЫБУЛЬСКАЯ.**

Прымiце да ведама

# ПЛАСТЫКАВЫ ПОСУД:

## ЗРУЧНА АБО НЕБЯСПЕЧНА?

**Сёння ніводзін пікнік не абыходзіцца без пластыкавага аднаразовага посуду. Ён лёгкі, зручны, і, што немалаважна, — яго не трэба мыць. Але ёсць у такога посуду адзін вельмі сур'ёзны мінус: ён можа быць небяспечным для здароўя.**

Здавалася б, што можа быць прасцей, чым знайсці посуд для пікніка (ды і не толькі для пікніка). Зайшоў у краму, узяў упакоўку аднаразовых пластыкавых талерак, відэльцаў і г.д. Выкарыстаў, выкінуў — вось і ўсё. Але, на жаль, харчовы пластык, з якога вырабляюць такі посуд, не такі ўжо і бяскрыўдны. З пластыкавага посуду ў прадукты харчавання могуць трапляць спецыяльныя дабаўкі, якія выкарыстоўваюць пры вырабе пластыку для даўгавечнасці матэрыялу. З'яўляючыся таксічнымі, яны і наносяць шкоду здароўю. Давайце разбяромся, які пластыкавы посуд можа быць небяспечны і чым.

Пры набыцці пластыкавага посуду ўважліва прыглядзьцеся да надпісаў на ім. Фірма-вытворца павінна пазначыць код, назву матэрыялу, з якога выраблены тавар, а таксама — і гэта абавязковая ўмова — дакладна сферу прымянення тавару (для халодных, гарачых, сыпучых матэрыялаў, вадкасці і г.д.). На пластыкавых лыжках, відэльцах і нажах такая інфармацыя, як правіла, павінна быць пазначана на агульнай упакоўцы.

### Пластыкавая азбука для спажыўца

**PS** — гэтыя лацінскія літары азначаюць, што ў склад посуду ўваходзіць полістырол. Менавіта таму такі харчовы пластык можна выкарыстоўваць толькі для халодных прадуктаў. Пры кантакце з гарачым, у тым ліку і пры разаграванні ежы ў мікрахвалёўцы, посуд выдзяляе таксічны стырол. Гэта ж шкоднае рэчыва пачынае выдзяляцца і пры кантакце са спіртнымі напоямі. Стырол мае ўласцівасць назапашвацца ў печані і нырках і можа прывесці да іх захворванняў, у прыватнасці да цырозу. Акрамя таго, можа абвастрыцца алергія, пацярпець нервовая сістэма. Посуд з полістыролу крохкі, вельмі лёгка ломіцца і пры кантакце з гарачым часцей за ўсё дэфармуецца.

**PP** — у склад посуду ўваходзіць поліпрапілен. Такі пластык можна выкарыстоўваць для гарачай ежы і напояў — ён вытрымлівае тэмпературу больш за +100 градусаў па Цэльсію. З поліпрапіленавых кубачкаў можна піць гарачую гарбату або каву, у такіх талерках можна разаграваць ежу ў мікрахвалевай печы. Але, на жаль, з алкаголем поліпрапілен таксама не сябруе. Пры кантакце з моцнымі напоямі посуд пачынае выдзяляць фармальдэгід або фенол. Гэта канцэраген, ад якога пакутуюць ныркі, печань, органы зроку. Посуд з поліпрапілену добра трымае цяпло і не ломіцца — толькі гнецца.

**Трохвугольнік з 3 стрэлак** — знак другаснай перапрацоўкі сыравіны. Тры стрэлкі азначаюць замкнёны цыкл: стварэнне — прымяненне — утылізацыя, г. зн. упакоўка (у нашым выпадку посуд) прыдатная для далейшай перапрацоўкі. Усярэдзіне трохвугольніка звычайна адна або дзве лічбы, якія сведчаць пра тып матэрыялу (напрыклад, 1—19 — пластык).

**Значок «кубак—відэлец»** сведчыць аб прыдатнасці пластыкавых вырабаў для кантакту з прадуктамі. Калі такі значок перакрэслены, то ежу ў іх захоўваць нельга.

### Карысныя парады

- Калі маркіроўкі няма ў прынцыпе, то лепш устрымацца ад набыцця падобнай прадукцыі.
- Спіртное з аднаразовых кубачкаў піць нельга. У любым пластыку ўтрымліваюцца таксічныя рэчывы, якія ў звычайных халодных напоях не раствараюцца, а вось у алкаголі — нават вельмі добра.
- Ні ў якім разе не ўздумайце пасля пікніка спальваць аднаразовы посуд. Дым, які пры гэтым выдзяляецца з пластыку, атрутны.
- Пастарайцеся пазбягаць кавярняў, дзе ежу падаюць у пластыку. Калі ўжо так атрымалася, не палянуйцеся паглядзець, ці правільна тут карыстаюцца пластыкавым посудам.
- Звярніце ўвагу: у некаторых аўтаматах для разліву напояў выкарыстоўваюцца кубачкі з полістыролу. Гэта значыць, гарачую каву, капучына або гарбату з іх піць нельга.
- Не забывайцеся, што спалучэнне «аднаразовы посуд» азначае: такі посуд можна выкарыстоўваць усяго толькі раз. Калі вы набылі, напрыклад, газаваную ваду ў пластыкавай бутэльцы, то пасля заканчэння напою і бутэлька павінна адправіцца ў вядро для смецця. Не варта выкарыстоўваць яе як сасуд для захоўвання малака, квасу і г.д. Бо высокая тэмпература прадуктаў або паветра, працяглы кантакт з харчовымі прадуктамі, ультрафіялетавыя промні і кісларод садзейнічаюць «старэнню» палімерных матэрыялаў. Як вынік, з іх выдзяляюцца рэчывы, шкодныя для арганізма чалавека, якія пераходзяць у харчовыя прадукты, што захоўваюцца ў такой тары. Гэта значыць малако, кампот, квас або іншыя прадукты становяцца таксічнымі і небяспечнымі для чалавека.

**Падрыхтавала Вольга ЦЫБУЛЬСКАЯ.**

Інфарм-укол

# ПРА ШТО РАСКАЖУЦЬ ЛЕЙКАЦЫТЫ?

**Гематалагічныя і агульнаклінічныя аналізы прымяняюцца ў практычнай медыцыне звыш 100 гадоў. Гематалагічнае даследаванне, або агульны аналіз крыві — адзін з важнейшых дыягнастычных метадаў, які адлюстроўвае рэакцыю крывятворных органаў на ўздзеянне розных фізіялагічных і паталагічных фактараў. У многіх выпадках яно мае вялікае значэнне для пастаноўкі дыягназу, а пры хваробах сістэмы кроваўтварэння яму адводзіцца вядучая роля.**

Паводле слоў **загадчыцы клініка-дыягнастычнай лабараторыі 18-й гарадской паліклінікі г. Мінска Таццяны СТРАЛЬЦОВАЙ**, агульнаклінічнае даследаванне крыві — гэта канцэнтрацыя гемаглабіну, колькасць эрытрацытаў, каляровы паказчык, колькасць лейкацытаў, хуткасць асядання эрытрацытаў (па-руску — СОЭ), формула крыві. У неабходных выпадках дадаткова вызначаюць час згусання крыві, працягласць кровацячэння, колькасць маладых эрытрацытаў (рэтыкулацытаў) і трамбацытаў.

Большасць паказчыкаў вызначаюць на гематалагічных аналізатарах, якія дазваляюць адначасова даследаваць ад 8 да 36 параметраў, якія ў сукупнасці даюць новую дыягнастычную інфармацыю.

У здаровага чалавека клетачны склад крыві досыць пастаянны, хоць і падвержаны некаторым зменам падчас розных фізіялагічных працэсаў. Пры захворваннях сістэма крыві рэагуе колькаснымі і якаснымі зменамі клетачнага складу крыві.

На даследаванне кроў з пальца бяруць раніцай нашча, да фізічнай нагрузкі, лячэбных ці дыягнастычных працэдур. У некаторых выпадках агульны аналіз крыві робіцца ўвечары. Паўторнае даследаванне пажадана рабіць у тыя ж гадзіны.

Самымі шматлікімі «жыхарамі» крыві з'яўляюцца эрытрацыты. У норме колькасць эрытрацытаў у жанчын — 3,5-4,5 млн, у мужчын — 4-5 млн. Жывуць эрытрацыты ад 90 да 110 дзён, пасля чаго наступае іх фізіялагічная старасць. Таму пасля лячэння анеміі — нізкай канцэнтрацыі гемаглабіну — аналіз крыві варта паўтараць не раней як праз 3-4 тыдні па завяршэнні лячэння. У чырвоны колер эрытрацыты фарбуе пігмент гемаглабін. У норме канцэнтрацыя гемаглабіну ў крыві складае 120-140 г/л у жанчын і 130-160 г/л у мужчын. Зніжэнне канцэнтрацыі гемаглабіну з'яўляецца адным з асноўных лабараторных сімптомаў анеміі. Анемія можа быць самастойным захворваннем, але часцей з'яўляецца сімптомам розных паталагічных працэсаў. Пры выяўленні анеміі абавязкова праводзіцца дадатковае даследаванне.

Важным дыягнастычным паказчыкам у агульным аналізе крыві з'яўляецца і колькасць лейкацытаў, у норме — ад 4000 да 9000. Калі асноўная функцыя эрытрацытаў і гемаглабіну — газаабмен у тканках, то асноўная функцыя лейкацытаў заключаецца ў абароне арганізма ад чужародных агентаў, паколькі яны валодаюць здольнасцю «паглынаць» мікробы. Працэс гэты, дарэчы, называецца фагацытозам.

Самы шматлікі атрад лейкацытаў складаюць гранулацыты — зярністыя лейкацыты, асноўнымі прадстаўнікамі якіх з'яўляюцца нейтрафілы. Яны самыя хуткія клеткі рэагавання, у іх цытаплазме ўтрымліваецца мноства дробных зярнят, якія ўтрымліваюць смяротныя для бактэрый рэчывы. Да зярністых лейкацытаў адносяцца і эазінафілы, і базафілы. Іх асноўная функцыя — «транспарт» важнага біягеннага аміну — гістаміну, лішак якога выклікае алергічныя рэакцыі, што праяўляюцца крапіўніцай і бранхіяльнай астмай.

Другая разнастайнасць лейкацытаў — агранулацыты, або лейкацыты, у якіх няма ў цытаплазме зярністасці. Да іх адносяцца манацыты і лімфацыты. Яны з'яўляюцца заснавальнікамі тканкавага і гумаральнага імунітэту. Працэнтныя суадносіны розных відаў лейкацытаў у разліку на 100 лейкацытаў складаюць лейкацытарную формулу. Пры розных паталагічных станах гэта формула можа значна мяняцца, што выяўляецца ў павелічэнні ці змяншэнні ўтрымання якога-небудзь віду лейкацытаў, або з'яўленні клетачных формаў, якія ў норме ў перыферычнай крыві не сустракаюцца.

Хуткасць асядання эрытрацытаў — СОЭ таксама з'яўляецца асноўным паказчыкам у агульным аналізе крыві. У норме СОЭ роўны 1-10 мм/г для мужчын і 2-15 мм/г для жанчын, і залежыць ад колькасці эрытрацытаў, іх дыяметра, аб'ёму. Залежыць СОЭ і ад вязкасці крыві, утрымання ў плазме бялковых фракцый, мукаполісахарыдаў, жоўцевых кіслот, пігментаў. СОЭ не служыць самастойным дыягнастычным паказчыкам, спецыфічным, уласцівым для якой-небудзь пэўнай хваробы. Аднак разам з лейкацытозам і адпаведнымі зменамі лейкацытарнай формулы павышэнне СОЭ з'яўляецца дакладнай прыкметай наяўнасці ў арганізме інфекцыйных і запаленчых працэсаў. У вострым перыядзе пры прагрэсаванні інфекцыйнага працэсу адбываецца павелічэнне СОЭ, у перыяд вылячэння СОЭ зніжаецца, але крыху больш павольна ў параўнанні з хуткасцю змяншэння лейкацытарнай рэакцыі. Пры аўтаімунных хваробах СОЭ дазваляе вызначыць стадыю хваробы (абвастрэнне або рэмісію), ацаніць яе актыўнасць, эфектыўнасць лячэння, але нармальныя паказчыкі СОЭ не заўсёды сведчаць аб адсутнасці паталагічнага працэсу. Запавольванне СОЭ назіраецца пры эрытрацытозе, значным згусанні крыві, пры гіпербілірубінеміі, павышэнні ўзроўню жоўцевых кіслот.

**Святлана БАРЫСЕНКА.**

Сезонны клопат

# АПТЭЧКА ДЛЯ АДПАЧЫНКУ

**Спецыялісты кажуць, што любому, хто адпраўляецца ў гарачыя краіны, не лішне будзе прайсці медыцынскі агляд. З асаблівай увагай павінны аднесціся да рэкамендацый урача людзі з хранічнымі захворваннямі, цяжарныя і сем'і з малымі дзецьмі.**

Паводле слоў **галоўнага ўрача 17-й гарадской дзіцячай паліклінікі г. Мінска Святланы ЯФІМЕНКІ**, у некаторых краінах існуе рэальная магчымасць заражэння асабліва небяспечнымі і паразітарнымі захворваннямі, якія маюць цяжкае клінічнае цячэнне. Таму неабходна пацікавіцца ў турфірме або іншай арганізацыі, якая забяспечвае вашу паездку, пра наяўнасць такіх захворванняў у той краіне або групе краін, якія вы збіраецеся наведаць. Не лішне азнаёміцца з умовамі пражывання, харчавання, культурнага адпачынку. Яшчэ лепш — самім вывучыць асаблівасці той ці іншай краіны, звычаі яе народа, санітарна-эпідэміялагічную сітуацыю.

Перад паездкай трэба сфарміраваць аптэчку першай дапамогі. У ёй неабходна мець: прэпараты антыбактэрыяльныя, абязбольваючыя, сардэчна-сасудзістыя, супрацьалергічныя, спазмалітыкі (но-шпа), страўнікавыя, вугаль актываваны і інш., а таксама сродкі ад укусаў насякомых, перавязачны матэрыял, бактэрыцыдны лейкапластыр, сонцаахоўны крэм.

Падчас паездкі ў краіны, неспрыяльныя па жоўтай ліхаманцы, неабходна абавязкова зрабіць прафілактычную прышчэпку і атрымаць адпаведнае міжнароднае пасведчанне аб вакцынацыі ў пункце прышчэплівання гарадской паліклінікі №19 па адрасе: г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 119, тэл. 267 07 22. Прышчэпка патрабуецца і падчас паездкі ў краіны, дзе на сёння ёсць менінгакокавая інфекцыя.

Выязджаючы ў краіны, неспрыяльныя па малярыі, неабходна атрымаць рэкамендацыі ў свайго ўрача аб прафілактычных лекавых прэпаратах і спосабах іх прымянення. Калі ў продажы адсутнічаюць супрацьмалярыйныя прэпараты, варта ў дзень выезду пачаць прымаць антыбіётык даксіцыклін і працягваць прымаць яго па 1 капсуле 1 раз у дзень не менш за 7 дзён. Па прыездзе ў неспрыяльную па малярыі краіну трэба купіць супрацьмалярыйны прэпарат, які ўжывае мясцовае насельніцтва, і прымаць яго па схеме (першы тыдзень адначасова з даксіцыклінам) падчас знаходжання ў краіне і па прыбыцці дадому, згодна з інструкцыяй па прымяненні.

Калі па вяртанні дадому з'явілася дрэннае самаадчуванне, павышаная тэмпература, неабходна тэрмінова звярнуцца да ўрача па месцы жыхарства і абавязкова паведаміць, што вы толькі вярнуліся з замежжа.

**Вытрымлівайце за мяжой простыя правілы:**

- Для піцця, чысткі зубоў, мыцця садавіны і гародніны і г.д. выкарыстоўвайце гатаваную ці бутыляваную ваду.
- Мыйце рукі як мага часцей.
- Ужывайце тэрмічна апрацаваную ежу з рэстаранаў, рэкамендаваных турыстычнай кампаніяй.
- Пазбягайце траплення вады ў ротавую поласць падчас купання ў басейне і моры.
- Не хадзіце басанож па незнаёмай мясцовасці з расліннасцю.
- Карыстайцеся рэпелентамі і іншымі сродкамі абароны ад камароў і іншых насякомых.
- Пазбягайце кантакту з жывёламі, свойскай і дзікімі птушкамі.

**Святлана БАРЫСЕНКА.**

## РАСШЫРАНЫМ ВЕНАМ — ЭЛАСТЫЧНЫЯ ПАНЧОХІ

**Варыкознае расшырэнне вен праяўляецца трыма асноўнымі прыкметамі: пашыранымі, набухлымі венамі, якія выпіраюць пад скурай; карычневата-шэрым колерам скуры ў вобласці галёнкаступнёвага сустава; пашкоджаннем скуры на шчыкалатках.**

У такіх сітуацыях рэкамендуецца пазбягаць працяглага стаяння або сядзення. Трэба часцей згінаць і разгінаць ногі, хадзіць. Напрыканцы дня трэба для аблягчэння стану ўзнімаць ногі прынамсі на 30 см над узроўнем сэрца. Гэта дазволіць пазбавіцца ацёку і свербу. Нязначныя сверб і ацёк можна папярэдзіць нашэннем эластычных гольфаў, панчох. Іх можна насіць і падчас цяжарнасці. Такое спецыяльнае адзенне перашкаджае звароту крыві ў пашыраныя сасуды, што дазваляе лепш забяспечваць кроўю цягліцы ног. Эластычныя панчохі прадаюцца ў аптэках і магазінах медтавараў. Надзяваць іх трэба раніцай, нават не ўстаючы з ложка. Насіць трэба ўвесь дзень. Пры гэтым панчохі не павінны празмерна сціскаць сцёгны і галёнкі. Не трэба забывацца і на рэгулярныя фізічныя нагрузкі. Хада, язда на веласіпедзе і плаванне зніжаюць ціск у венах і пазбаўляюць ад дыскамфорту.

Хваробы стагоддзя

# КОЖНЫ ДРУГІ ЧАЛАВЕК, ЯКІ ДАСЯГНУЎ 70 ГАДОЎ, МАЕ РЫЗЫКУ АТРЫМАЦЬ РАК СКУРЫ

**Ужо некалькі гадоў запар у Мінску праводзіцца акцыя «Мінчане — супраць раку», накіраваная на прафілактыку анкалагічных захворванняў. Сёлета мерапрыемствы адбудзецца пад дэвізам «Здаровая скура — таксама важна» і будзе прысвечана прафілактыцы раку скуры.**

**Акцыя пройдзе 5 ліпеня з 9.00 да 18.00 ва ўсіх дарослых лячэбна-прафілактычных установах горада, паліклініках, прыёмных аддзяленнях клінічных бальніц, клінічных анкалагічным і скурна-венералагічным дыспансэрах.**

**У гэты дзень любы ахвотны жыхар Мінска зможа трапіць на прыём да кваліфікаваных спецыялістаў, анколагаў і дэрматолагаў, першасны агляд таксама будуць праводзіць хірургі.**

**Пра тое, наколькі актуальнай анкалагічнай праблемай з'яўляецца рак скуры, расказаў галоўны пазаштатны анколаг камітэта па ахове здароўя Мінгарвыканкама, галоўны ўрач Мінскага гарадскога клінічнага анкадыспансэра, кандыдат медыцынскіх навук Зігмунд ГЕДРЭВІЧ.**

— Скура з'яўляецца самым буйным органам у чалавека, бо займае большую частку цела. І, зразумела, на гэтую частку прыпадае значная колькасць захворванняў. Анкалагічныя — адны з іх. Пік захваральнасці на рак скуры прыпадае на ўзрост 70—74 гады. Такім чынам, кожны другі чалавек, які дасягнуў 70-гадовага ўзросту, мае рызыку захварэць на злаякасную пухліну скуры.

Гэтыя пухліны могуць дастаткова хутка вывесці хворага са строю і нават прывесці да лятальнага канца. Найбольш часта сустракаецца такая форма раку скуры як базаліёма. Гэта ўтварэнне, якое пашкоджвае адкрытыя ўчасткі скуры: твар, рукі і інш. Часцей за ўсё церпяць людзі, якія маюць светлы колер скуры і валасоў. Базаліёма працякае адносна спрыяльна, яна не дае аддаленых метастазаў, г. зн. не дае даччыных ачагоў у органы і тканкі.

Больш агрэсіўна працякае плоскаклетачны рак скуры. Ён мае прыкладна такія ж клінічныя характарыстыкі, як і базаліёма, і недасведчанаму чалавеку складана адрозніць гэтыя дзве формы анкалогіі. А між тым плоскаклетачны рак скуры ўжо на працягу года дае метастазы ў рэгіянарныя лімфатычныя вузлы, можа метастазіравацца ў косткі, лёгкія, галаўны мозг. Калі гэтае захворванне своечасова не пачаць лячыць, то могуць развіцца вельмі сур'ёзныя наступствы.

Яшчэ больш небяспечнай з'яўляецца меланома. Гэтая злаякасная пухліна развіваецца часцей за ўсё з радзімых знакаў і ў некаторых асобаў працякае імгненна. Чалавек можа загінуць на працягу аднаго года. Гэта гаворыць пра вялікую агрэсію пухліны.

Пухліны, якія я назваў, вельмі часта размяшчаюцца на адкрытых, бачных участках цела. Аднак клініка іх такая, што чалавек, як правіла, не звяртае на гэтыя ўтварэнні ўвагу. Часам яны падобныя на звычайныя запаленыя прышчыкі, пакрытыя лупінай. Бывае, гэта радзімка, якую бачым шмат гадоў, але потым у ёй пачалі адбывацца змены. Напрыклад, у выніку траўмы ў аснове радзімкі з'явілася запаленне, яна пачала кроватачыць, змянілася яе форма. Як правіла, пацыентаў гэта зусім не насцярожвае, але выклікае трывогу ва ўрачоў. Таму мэта акцыі «Мінчане супраць раку» выявіць менавіта тых пацыентаў, якія нават не допускаюць, што ў іх ёсць злаякасная пухліна на скуры. І мы хацелі б, каб усе мінчане, у якіх ёсць незразумелыя ўтварэнні на скуры, звярнуліся ў свае паліклінікі да кваліфікаваных спецыялістаў, што будуць працаваць у гэты дзень, каб вызначыць прыроду такіх утварэнняў. Да ўрача трэба звярнуцца, калі: у поласці рота, на вуснах, языку з'явілася небалючае зацвярдзенне, язвачка; радзімы знак павялічыўся ў памерах, памяняў форму ці афарбоўку, з'явіўся сверб, кроватачывасць; працягла не загойваюцца язвачкі і трэшчыны на скуры твару, тулава, канечнасцях, палавых органах.

***— Якія могуць быць меры прафілактыкі раку скуры?***

— Трэба пазбягаць працяглага ўздзеяння прамых сонечных прамянёў (ультрафіялету) на скуру. Таму ў сонечныя дні варта насіць шыракаполыя капелюшы, каб абараніць твар і шыю, таксама рэкамендуецца карыстацца сонцаахоўнымі крэмамі. Трэба пазбягаць паўдзённага сонца, асабліва на моры ў трапічных і субтрапічных краінах. Неабходна своечасова лячыць запаленчыя працэсы скуры, выдаляць бародаўкі, папіломы і іншыя дабраякасныя ўтварэнні на скуры. І абавязкова звяртайцеся да ўрача пры з'яўленні прыкметаў паталогіі з боку скураных покрываў.

***— Пра якія сучасныя метады лячэння раку скуры можна гаварыць сёння?***

— Вядучым метадам з'яўляецца хірургічны. Але яго можна прымяніць не заўсёды. Калі паталогія знаходзіцца на спіне, жываце, іншых закрытых участках цела, то аператыўнае ўмяшанне прымяняецца. Але ж калі пухліна лакалізуецца на твары, гэты метад не заўсёды пажаданы ў сувязі з тым, што могуць застацца касметычныя дэфекты. Таму ў такіх выпадках прымяняюцца іншыя метады, напрыклад, каратка-фокусная рэнтгенатэрапія. Яна дае добры касметычны эфект і пасля застаецца толькі белаваты рубчык.

Апошнія гады выкарыстоўваецца электрадыструкцыя і лазерная тэрапія ў лячэнні базаліём.

Што датычыцца плоскаклетачнага раку, то ён бывае ў вялікіх памерах, і гэта патрабуе часцей за ўсё камбінаванага лячэння, спалучэння прамянёвага метаду і хірургічнага.

Хворыя з раннімі стадыямі раку скуры (1—2) вылечваюцца ў 80—100% выпадкаў.

**Вольга ШАЎКО.**

# Крынічка

«Цякла тут з лесу невялічка
Травой зарослая крынічка».
Якуб КОЛАС.

Рубрыку вядзе Валянціна ШПІЛЕЎСКАЯ, тэл. 285 88 81 № 22 (352)

## Перац салодкі

***«Як сфарміраваць кусцікі перцу салодкага, якія растуць у цяпліцы, а таксама каля яе»?***

**К. Craнoвіч,** *Барысаўскі раён.*

Куст перцу салодкага трэба фарміраваць, абрываючы часткі вегетатыўных галінак. Асабліва гэта важна рабіць у цяпліцах, дзе кліматычныя ўмовы для росту і развіцця цеплалюбівых культур больш спрыяльныя, чым на вуліцы.

Па-першае, у расліны перцу абрываецца завязь велічынёй з грэцкі арэх з разгалінавання галоўнага сцябла. Калі новыя сцёблы вырастуць з разгалінавання галоўнага і маюць ужо 20 см у даўжыню, трэба абарваць пасынкі, якія растуць у бакавых сцёблах, асабліва знізу, пакінуўшы ў кожным з міжвузлоў адзін ліст і адну завязь і абарваўшы верхавінку кожнага бакавога сцябла. З наступных міжвузлоў цэнтральнага праваднікa бакавое сцябло ўкарочваецца за першым лістом, каб не заставаўся за ім плод ці кветка. Вышэй за 4-5-ы вузел не абразаецца, пакідаецца натуральная даўжыня. Адначасова на расліне пакідаецца толькі 8-10 пладоў, але іх маса будзе ў два разы большая, чым у куста без фарміравання, а плады будуць яшчэ мець тоўстыя сценкі.

Агратэхніка перцу салодкага ў адкрытым грунце не патрабуе абрэзкі сцёблаў, трэба толькі абавязкова выдаліць першую завязь. Добра было б пры вырошчванні перцу праз 5-7 м у радзе паставіць слупкі, нацягнуць дрот ці шпагат і падвязаць цяжкія сцёблы з пладамі, каб яны не адламаліся. Можна паставіць «васьмёркай» на ўзроўні галоўнага разгалінавання. У адкрытым грунце перцы варта падвязваць да калкоў — кожны куст асобна, каб сцёблы не ляжалі на зямлі, а плады не пэцкаліся.




А — першая завязь з разгалінавання галоўнага сцябла ўбіраецца; Б — месца абрэзкі бакавых галінак; В — вышэй за 4-5-ы вузел не абразаецца.

## Кізіл



Кізіл распаўсюджаны звычайна ва Украіне, у Малдове, на Каўказе, але і ў нас дрэва карыстаецца папулярнасцю. Плады — сакавітыя, цыліндрычныя ці авальныя касцянкі, даўжынёй 1—3 см і масай да 5 г ружовага, жоўтага, рубінавага колеру.

Адна з легендаў, распаўсюджаных у Крыме, сведчыць пра тое, як Алах вырашыў надзяліць людзей дрэвамі: адзін папрасіў сабе вішню, другі — яблыню, трэці — грушу, а Шайтан, які апынуўся непадалёк, папрасіў кізіл. Палічыў хітрун, што дрэва цвіце рана, значыць будуць раннія ягады, такія заманлівыя і спакуслівыя — сакавітыя, чырвоныя, як вішні. Але вось і лета мінае, а кізіл усё застаецца зялёным. Раззлаваўся Шайтан і адмовіўся ад дрэва. А позна ўвосень у лес прыйшлі людзі, сабралі смачныя салодкія плады і ў насмешку над нячысцікам прысвоілі дрэву яго імя. З таго часу ў Крыме называюць кізіл «шайтанавай ягадай».

Са старажытнасці кізіл аднусілі да карысных раслін. Драўніна яго адна з самых трывалых у раслінным свеце, шырока выкарыстоўвалася для вырабу зброі (у прыватнасці, лукаў і стрэл) і музычных інструментаў, якія не псаваліся на працягу стагоддзяў. Нездарма паэт Старажытнай Грэцыі Гамер узброіў Адысея кізілавай стралой, а бацька медыцыны Гіпакрат у сваіх працах высока ацаніў вяжучыя ўласцівасці кізілавых лістоў, рэкамендуючы прымяняць іх адвар пры хваробах страўніка.

Дзякуючы багатаму ўтрыманню біялагічна актыўных рэчываў у пладах, костачках, лістах, кары і каранях гэта расліна карыстаецца папулярнасцю і даўно выкарыстоўваецца ў народнай медыцыне. Свежыя плады і прадукты іх перапрацоўкі ўрачы рэкамендуюць пры страўнікава-кішачных расстройствах, прастудных захворваннях, у якасці агульнаўмацавальнага, танізуючага і мачагоннага сродку. Кізіл раяць ужываць пры малакроўі, падагры, хваробах скуры, парушэннях абмену рэчываў; настой кветак, сок і настой пладоў — як супрацьліхаманкавы сродак. Адвар кары і каранёў служыць для лячэння хваробаў страўніка і печані.

Плады збіраюць у сухое надвор'е з пладаножкамі, якія на дрэве выспяваюць неадначасова, на працягу 25—40 дзён у залежнасці ад умоў вырошчвання і асвятлення. Плады здольныя даспяваць пры захоўванні, знятыя ў перыяд тэхнічнай спеласці, і вытрымліваць працяглыя перавозкі. Але больш смачныя плады, калі яны сабраныя з дрэва ў перыяд поўнай спеласці.

З кізілу можна прыгатаваць кампот, сок, пюрэ, сіроп, варэнне. Нават робяць кізілавую гарэлку, якая мае цудоўны рабінавы колер і крыху кіслая на смак. Спелыя плады сушаць на сонцы або ў духоўцы пры 50—60 градусах.

## І ежа, і лякарства

У сярэдзіне лета на многіх агародах можна ўбачыць расліну, кветкі якой падобныя на сланечнік, але гэта расліна не менш карысная — гэта земляная груша.

**Тапінамбур**, ён жа земляная груша, ён жа іерусалімскі артышок з даўніх часоў вырошчвалі ў Паўночнай Амерыцы, і назву сваю ён атрымаў ад індзейскага племені — тупінамба. У Еўропу гэта дзіўная расліна трапіла ў самым пачатку XVII стагоддзя. Земляная груша — расліна аднагадовая, аднак за здольнасць клубняў перазімоўваць у зямлі і захоўваць усходжасць многія лічаць яе шматгадовай. Да глебы расліна непатрабавальная, толькі не любіць моцна забалочаных тарфянікаў, лёгка пераносіць засуху, таму што мае развітую каранёвую сістэму. На адным месцы можа расці да 7 гадоў.

У тапінамбуры мноства вартасцяў. Па-першае, у яго смачныя і вельмі пажыўныя клубні, яны ніколькі не ўступаюць бульбе, і страў з іх таксама можна прыгатаваць вялікае мноства. Па-другое, гэта каштоўная лекавая культура: у клубнях вялікі набор мікраэлементаў. Па ўтрыманні жалеза, крэмнію і цынку тапінамбур пераўзыходзіць бульбу, моркву, буракі. У склад клубняў уваходзяць вітаміны C, $B_1$, $B_2$, бялкі, пектын, амінакіслоты, а таксама цукры ў форме інсуліну, таму іх выкарыстоўваюць для лекавага харчавання хворых на цукровы дыябет, атэрасклероз, гіпертанію.

Дарэчы, зялёная маса тапінамбуру таксама лекавая, як і клубні. Вельмі карысныя ванны з сухіх лістоў і сцёблаў пры болях у суставах (дробна парэзаць, заварыць, прымаць ванну 30—40 хвілін, адзін раз на тыдзень).

З сырых клубняў гатуюць смачныя салаты: памыць, пачысціць, натаркаваць на буйной тарцы, дадаць цыбулю-рэпку і заправіць алеем. Карысна і хворым, і здаровым. Асабліва важна, што такую салату можна гатаваць у самы «безвітамінны» час — ранняй вясной, калі толькі растане зямля і можна даставаць з яе клубні. У гэты час няма ні радыскі, ні іншай свежай агародніны, а земляная груша захоўвае ўсе свае якасці і смак. Выдатная страва атрымліваецца, калі запячы клубні тапінамбуру з маслам у печы або ў духоўцы.

Гатуюць з тапінамбуру нават каву. Наразаюць клубні тонкімі скрылёчкамі, высушваюць на патэльні да карычневага колеру, затым размолваюць у кавамлынку. Многім падабаецца смак, а пра карысць гаварыць не трэба.

Тапінамбур з'яўляецца выдатным кормам для ўсіх свойскіх жывёл. У сырым, запараным, сіласаваным выглядзе яго клубні па пажыўнасці не ўступаюць бульбяным. Сілас са сцёблаў і лістоў змяшчае шмат цукру і выдатна паядаецца і каровамі, і свіннямі, і птушкай.

Вырошчваць тапінамбур нескладана, ён не такі патрабавальны, як бульба, не пашкоджваецца фітафтаразам, і, што вельмі важна, яму не страшны каларадскі жук.

Карысных якасцяў у тапінамбуры шмат, але, разрастаючыся, ён сапраўды можа ператварыцца ў назойлівае пустазелле. Карані яго залягаюць глыбока, і дабрацца да іх не вельмі проста. Каб карані не распаўзаліся па ўчастку, вакол тапінамбуру закапайце у грунт стары шыфер альбо руберойд на глыбіню 50 см.

## Макаўка лета

Ліпень — сярэдзіна лета, самы гарачы месяц года. Гарачыня можа нечакана змяніцца навальніцай, якая хутка мінае, а горача бывае нават уначы. Надыходзіць пара першых ураджаяў, і ўсюды мора кветак на любы густ.

У ліпені пачынаецца масавы збор маліны, парэчкі, яшчэ пладаносяць суніцы садовыя. Збіраць плады і ягады лепш у сухое халаднаватае надвор'е раніцай, калі сыдзе раса.

Часта ягады чырвоных і чорных парэчак выспяваюць практычна адначасова. Але калі ягады чорных парэчак могуць асыпацца, чырвоных — яшчэ больш чырванеюць і спеюць, то ўборку ўраджаю трэба пачынаць з чорных. Чырвоныя парэчкі здымаюць з кісцямі, а чорныя можна з кісцямі і без іх. Пры ўборцы маліны і суніц садовых трэба старацца зрываць ягады з чашалісцікамі, тады яны могуць захоўвацца крыху даўжэй. У канцы ліпеня сад трэба паліць і падрыхліць. Паліваць дрэвы трэба не пазней чым за 3-4 тыдні да збору ўраджаяў.

Самы небяспечны шкоднік у гэтым месяцы — яблыневая пладажэрка. Паколькі хімічных сродкаў прымяняць у час выспявання пладоў нельга, шкоду, якую яна наносіць, можна знізіць з дапамогай лоўчых паясоў. Іх накладваюць з мешкавіны ці абгортвальнай паперы. Пасля ўборкі ўраджаю іх трэба зняць і знішчыць разам з вусенямі.

Канец ліпеня — лепшы час для акуліроўкі. З выбранай матачнай расліны нарэзаць парасткі даўжынёй не менш як 40 см. Нельга зрэзваць парасткі з цэнтральнага праваднікa і асноўных галін (гэтым можна сапсаваць крону), а таксама браць кароткія парасткі — на іх могуць быць размешчаны кветкавыя пупышкі, асабліва ў костачкавых. У зрэзанага парастка выдаляюць лісцікі, пакідаючы чаранкі ад лісцікаў у 1 см.

У агародзе ў ліпені перш за ўсё трэба сачыць за тэмпературай у цяпліцы, дзе растуць агуркі, таматы, перцы, баклажаны. Пры тэмпературы вышэй чым 38—40 градусаў кветкі памідораў і агуркоў дрэнна апыляюцца і нават асыпаюцца. У гэтым выпадку цяпліцы праветрываюцца, адкрываюцца дзверы і фрамугі. Трэба памятаць, што цеплалюбівыя культуры, такія, як баклажаны, не любяць скразняку.

Агуркам і таматам у гэты перыяд асабліва патрэбныя палівы і падкормкі. Ваду для паліву выкарыстоўваць толькі падагрэтую. Пры сухім надвор'і памідоры трэба паліваць 2 разы на тыдзень пад корань, не закранаючы лісты. Калі ўдзень тэмпература складае 20 градусаў, а ўначы апускаецца ніжэй за 10 градусаў, то пры высокай вільготнасці трэба ў хуткім часе чакаць расы і ўспышкі фітафтарозу. Таматы на ноч прыкрываюць плёнкай, якая запавольвае развіццё гэтай хваробы.

У ліпені сталовым буракам патрэбна паўторнае прарэджванне для атрымання больш буйных караняплодаў. Добра рассадзіць расаду па краі любой градкі.

Рэгулярнае рыхленне і акучванне белакачаннай капусты паляпшае развіццё каранёвай сістэмы, паскарае адрастанне лістоў. Брусельскую капусту не варта часта паліваць, таму што гэта выклікае разрастанне лістоў, што шкодзіць утварэнню качанчыкаў.

Пасля збору першага ўраджаю на выслабаненыя градкі, у тым ліку і пад плёнку, можна пасадзіць такія хуткаспелыя культуры, як радыска, цыбуля на пяро, салата, шпінат, шчаўе і інш. Трэба памятаць, што летнім усходам патрабуецца больш часты паліў, чым веснавым.

Пасля 15—20 ліпеня сеюць чорную рэдзьку і дайкон для асенне-зімовага спажывання (калі пасеяць раней, яны пойдуць у стрэлку). Іх можна высяваць да канца ліпеня.

Вельмі часта расліны пакутуюць ад лічынак хрушчоў, якія паядаюць клубні бульбы і караняплоды морквы. Лічынак трэба знішчаць, паліваючы расліны пад корань растворам марганцоўкі (2—5 г на 10 л вады).

## А не шкодзь!

# РЫБАЛКА ЗА 15 МІЛЬЁНАЎ? ЦІ ВАРТА РЫЗЫКІ?

Пра вынікі работы за перыяд абмежаванняў на лоўлю рыбы падчас вясенняга нерасту расказаў начальнік Дзяржаўнай інспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету пры Прэзідэнце Беларусі Мікалай ФУРСЕВІЧ

**Здаецца, прасцей было б па рыбу пайсці ў краму, а на тыя грошы набыць, ну... хоць які аўтамабіль ці ў хату карысную рэч. Ва ўсялякім разе, не на вецер жа грошы выкідаць! Думаю, са мной згодзіцца кожная жонка заядлага рыбака, якому нават забароны і абмежаванні хоць бы што. Такія ўжо аматары павудзіць! Магчымасць адпачыць, падумаць пра жыццё-быццё, падыхаць свежым паветрам, адчуць азарт працэсу... Але толькі калі ў рамках закону.**

Амаль 150 кіламетраў рыбацкіх сетак (а гэта адлегласць ад Мінска да Баранавічаў!) ліквідавала Дзяржінспекцыя па ахове жывёльнага і расліннага свету за перыяд вясенняга нерасту з 1 красавіка па 30 мая, а таксама адну электралавільную канструкцыю, больш за тысячу іншых прылад рыбалоўства і больш за 4 тоны незаконна вылаўленай рыбы. Сёлета выяўлена столькі ж парушэнняў, як і летась.

Час нерасту — адзін з гарачых у інспекцыі кожнага раёна, бо ўводзяцца абмежаванні на лоўлю рыбы. Але, відаць, для таго і правілы, каб іх парушалі.

Інспекцыя не ставіла перад сабой мэту дзень і ноч пільнаваць каля вадаёмаў. Але гэта не датычыцца нерасту асабліва каштоўных відаў рыб. Для стварэння найбольш спрыяльных умоў месцы, якія яны насяляюць, бралі пад асаблівы кантроль.

За час нерасту праведзена амаль дзве тысячы рэйдаў, выяўлена больш за 3 тысячы парушэнняў прыроднага заканадаўства. Супрацоўнікі Дзяржінспекцыі спынялі асабліва цяжкія, нават замаскіраваныя правапарушэнні, якія здзяйснялі арганізаваныя групы. Далейшы лёс такіх парушэнняў вырашаецца ў следчых органах МУС, па некаторых з іх заводзяцца крымінальныя справы.

На жаль, многія парушальнікі не спыняюцца нават пасля паўторнага накладання на іх адміністрацыйнай адказнасці на працягу аднаго года за такое ж парушэнне. Гэта пры тым, што ў дачыненні да браканьераў прымаюцца дастаткова жорсткія штрафныя санкцыі, прадугледжваецца нават крымінальнае пераследаванне. У параўнанні з мінулым годам сума выстаўленых штрафаў павялічылася з 460 мільёнаў рублёў да 580 мільёнаў. Работнікі Дзяржінспекцыі адпаведна заканадаўству носяць форменнае абмундзіраванне з адметнымі знакамі, маюць права праверкі дакументаў, спынення транспартных і плывучых сродкаў, правядзення іх дагляду. Таксама інспектары могуць рабіць дагляд фізічных асобаў, якія ўчынілі правапарушэнне, насіць і прымяняць баявую зброю.

Дарэчы, нямала правапарушэнняў спынена дзякуючы простым грамадзянам, неабыякавым да лёсу сваёй краіны. Добрасумленныя людзі тэлефануюць на нумары «гарачай лініі», прысылаюць паведамленні пра месцы браканьерства на інтэрнэт-сайт Дзяржаўнай інспекцыі. За вясенні перыяд толькі на тэлефоны «гарачай лініі» паступіла 515 паведамленняў аб парушэннях прыродаахоўнага заканадаўства. У выніку праверак выяўлена 315 парушэнняў. Значную частку браканьерскіх сетак і іх уладальнікаў знаходзяць менавіта па інфармацыі грамадзян. Гэта сведчыць пра давер да гэтай службы.

Так, Лепельскай інспекцыяй сумесна з Лепельскім РАУС за незаконную здабычу рыбы быў затрыманы жыхар вёскі Губіна гэтага раёна, рыбалка яму абышлася ў 246 базавых велічынь (больш за 8,5 мільёна). Два жывёлаводы СПК «Межаны» і студэнт Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта затрыманы таксама за незаконную лоўлю рыбы дзяржінспектарамі Браслаўскай міжраённай інспекцыі сумесна з супрацоўнікамі Браслаўскага аддзела дэпартамента аховы МУС Беларусі. У гэтым выпадку шкода была ўчынена на 260 базавых велічынь. Работнікі Верхнядзвінскай міжраённай інспекцыі затрымалі жыхара раёна, які налавіў рыбы на 461 базавую велічыню, гэта больш за 15 мільёнаў.

Немалаважная роля ў рабоце з насельніцтвам адводзіцца інтэрнэт-сайту Дзяржінспекцыі, высокая якасць і інфармацыйнасць якога спрыяе росту яго папулярнасці сярод карыстальнікаў інтэрнэта — грамадзян Беларусі і замежных краін, для якіх спецыяльна створана англамоўная версія сайта.

Указам Прэзідэнта створаны Інстытут грамадскіх інспектараў. Імі могуць быць паўналетнія добрасумленныя грамадзяне, якія гатовы браць актыўны ўдзел у ахове жывёльнага і расліннага свету нашай краіны. Уступіць у рады такіх інспектараў няпроста. Для пачатку варта праявіць сябе, аднак самастойна затрымліваць браканьераў яны не маюць права. Напачатку яны супрацоўнічаюць з інспекцыямі ў рэжыме дапамогі. Пасля ахвотны піша заяву па месцы жыхарства ў бліжэйшую міжраённую інспекцыю. У якасці інспектараў на сёння зарэгістравана каля 50 грамадзян. Такія інспектары маюць права на сумесны ўдзел у рэйдавых мерапрыемствах. «Для Дзяржінспекцыі людзі, якія знаходзяцца ў лесе, аднолькавыя. Нягледзячы на іх пасады і рангі нельга патураць і даваць скідкі», — папярэджвае М. Фурсевіч.

**Таццяна БОЛТУЦЬ.**

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.



Чэрвеньскі раён. Вадасховішча Волма.

## У ФІНЛЯНДЫІ — АПАЗНАННЕ, У ЭСТОНІІ — ДОПЫТ...

### А ў Расіі — вочная стаўка

У такую гульню згулялі кіраўнікі пракуратуры Фінляндыі, Эстоніі, работнікі Генеральнай пракуратуры Расіі і пракурор Віцебскай вобласці. Гэтая прафесійная гульня дазволіла адпрацаваць узаемадзеянне пракурорскіх структур розных краін у барацьбе з міжнароднай злачыннасцю. Гульню з выкарыстаннем сродкаў відэасувязі правялі падчас рабочай сустрэчы ў пракуратуры Пскоўскай вобласці. Гэты рэгіён — на мяжы з Віцебшчынай. Таму пракурор Віцебскай вобласці Генадзь Дыско быў запрошаны на сустрэчу.

Як паведаміла «Звяздзе» старшы памочнік пракурора Віцебскай вобласці Ірына Таўтын, пракуроры абмеркавалі нюансы і праблемы міжнароднага супрацоўніцтва, а таксама комплекс мераў па спрашчэнні міжнароднага ўзаемадзеяння ў сферы крымінальнай судовай вытворчасці.

Пракурорскія работнікі, дарэчы, праводзяць і міжнародныя футбольныя сустрэчы. Прадстаўнікі Прыдзвінскага края паказалі высокі клас на гульні ў знакамітых Лужніках. І ў сябе дома літаральна разграмілі на полі футбалістаў з пракуратуры Масквы.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

## ПАКРЫХУ «НАДАІЛА»

**Каб незаконна атрымаць грошы, неабходна знайсці нейкую шчыліну, праз якую можна тыя грошы класці ў сваю кішэню. Іншым разам ашуканства раскрываецца хутка, а здараецца, што і праз некалькі гадоў.**

Кошт на малако, якое насельніцтва прадае дзяржаве, залежыць ад яго тлустасці. Гэта вельмі добра ўсвядоміла спецыяліст аднаго з сельсаветаў Івацэвіцкага раёна. І людзі, якія кожную раніцу здавалі малако, не ведалі, што пэўны працэнт ад кошту гэтага малака забірае сабе спецыяліст.

Жанчына крыху зніжала тлустасць малака і адразу ж па дакументах праходзіла малака больш, чым было здадзена. Затым лішак малака распісваўся на людзей, сярод якіх аказаліся і тыя, у каго кароў не было, а грошы спецыяліст забірала сабе. Маніпуляцыя з тлустасцю малака працягвалася больш за тры гады, а калі махінацыя раскрылася, то аказалася, што спецыяліст «надаіла» са здатчыкаў малака амаль на 8 мільёнаў.

Нягледзячы на тое, што падследная вярнула ўкрадзеныя мільёны і супрацоўнічала з праваахоўнымі органамі, ёй давялося панесці пакаранне.

Суд Івацэвіцкага раёна аштрафаваў жанчыну на 50 базавых велічыняў і забараніў на два гады выконваць абавязкі, звязаныя з арганізацыйна-гаспадарчай дзейнасцю. Адным словам, весці разлікі па здадзеным малацэ ў гэтым сельсавеце будзе нехта іншы.

**Сымон СВІСТУНОВІЧ.**



## ИЗВЕЩЕНИЕ ОБ ОТКРЫТОМ ПОВТОРНОМ АУКЦИОНЕ ПО ПРОДАЖЕ ПРАВА АРЕНДЫ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ ПОД СТРОИТЕЛЬСТВО И ОБСЛУЖИВАНИЕ ТОРГОВЫХ ОБЪЕКТОВ

| Номер лота | Наименование объекта | Местонахождение объекта | Площадь земельного участка, га | Кадастровый номер | Начальная цена продажи, руб. | Сумма задатка, руб. | Стоимость затрат на формирование земельного участка и госрегистрацию | Форма проводимого аукциона | Срок аренды участка |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Право аренды земельного участка | г. Слоним, ул. Подлесная, 39 | 0,3157 га. В том числе 0,1789 га земель общего пользования, 0,1368 га неиспользуемых земель | 425450100001007261 | 3632800 | 350000 | 684180 | Открытый аукцион с условиями, в использовании земельного участка имеются ограничения – охранная зона ЛЭП напряжением до 1000 В на площади 0,0100 га | 10 лет |
| 2 | Право аренды земельного участка | г. Слоним, ул. Минский Тракт, 105а | 0,1283 га. В том числе 0,0905 га пахотных земель, 0,0271 га под древесно-кустарниковой растительностью, 0,0107 га земель общего пользования | 425450100001007260 | 8897110 | 880000 | 618198 | Открытый аукцион с условиями, без ограничений в использовании земельного участка. Возмещение победителем аукциона расходов, связанных с потерями сельскохозяйственного производства в сумме 1340190 белорусских рублей. | 10 лет |
| 3 | Право аренды земельного участка | г. Слоним, ул. Южная, 40а | 0,0969 | 425450100001006917 | 845420 | 80000 | 668994 | Открытый аукцион с условиями,без ограничений в использовании земельного участка | 10 лет |
| 4 | Право аренды земельного участка | г. Слоним, ул. Мицкевича | 0,1992 | 425450100001006733 | 1730050 | 170000 | 594591 | Открытый аукцион с условиями, в использовании земельного участка имеются ограничения – охранная зона ЛЭП напряжением до 1000 В на площади 0,0133 га | 10 лет |

**Условия продажи объекта:** 1. Внесение победителем аукциона платы за право заключения договора аренды земельного участка.

2. Возмещение победителем аукциона расходов, связанных с проведением аукциона и формированием земельного участка, в том числе государственной регистрацией в отношении создания земельного участка.

3. Заключение победителем аукциона договора аренды земельного участка со Слонимским райисполкомом и осуществление в 2-месячный срок после принятия решения райисполкома о предоставлении ему земельного участка государственной регистрации права на земельный участок.

4. Получение победителем аукциона в установленном порядке разрешения на проведение проектно-изыскательских работ и разработки строительного проекта на строительство объекта в срок, не превышающий 2 года.

5. Строительство торгового объекта (магазина) в сроки, определенные проектно-сметной документацией, и обслуживание его.

6. Благоустройство прилегающей территории в течение 2 лет.

**Лицо, желающее принять участие в аукционе, представляет:**

заявление на участие в аукционе с указанием кадастровых номеров и адресов земельных участков, которые предполагается получить в аренду по результатам аукциона;

заверенную банком копию платежного поручения о внесении суммы задатка на р/счет 3642525000521 в филиале 422 ОАО «АСБ Беларусбанк» в г. Слониме код банка 852, УНП 500010377.

**Гражданин** – копию документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования (паспорт).

**Индивидуальный предприниматель** – копию свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя без нотариального засвидетельствования.

**Представителям гражданина или индивидуального предпринимателя** – нотариально удостоверенная доверенность.

**Юридическое лицо** – представителям или уполномоченному должностному лицу юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии устава и свидетельства о государственной регистрации юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица.

**Юридическое лицо** – нерезидент Республики Беларусь – представителю или уполномоченному должностному лицу иностранного юридического лица – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык, легализованные в установленном порядке доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык.

**Представитель иностранного гражданина** – легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан, индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, уполномоченные должностные лица юридических лиц предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

Аукцион проводится при наличии двух или более участников аукциона.

Не допускается начало торгов по начальной цене. Торги продолжаются до тех пор, пока по новой объявленной аукционистом цене аукционный номер поднял только один участник аукциона. Аукционист называет последнюю цену и номер данного участника трижды и объявляет проданным предмет аукциона словом «продано», а участника аукциона – победителем.

Всем участникам предоставляется право ознакомиться с земельно-кадастровой документацией, а также возможность осмотра местности земельного участка, выставляемого на торги.

Победитель аукциона обязан оплатить расходы, связанные с подготовкой и проведением аукциона, и расходы, связанные с подготовкой документации, необходимой для поведения аукциона, в течение 10-ти рабочих дней со дня принятия местным исполнительным комитетом решения о предоставлении победителю аукциона земельного участка. В случае, если победитель аукциона в установленный срок не внес плату за земельный участок, то внесенный им задаток и оплата расходов, связанных с подготовкой и проведением аукциона, расходов, связанных с подготовкой документации, необходимой для проведения аукциона, возврату не подлежат.

Платеж за объект осуществляется единовременно по безналичному расчету в расчетных билетах Национального банка Республики Беларусь.

В случае победы расходы, связанные с подготовкой и проведением аукциона, подготовкой документации, необходимой для проведения аукциона, возмещает покупатель объекта.

Всем желающим предоставляется возможность ознакомиться с объектами.

**Аукцион состоится 5 августа 2010 года в 10.00 по адресу: г. Слоним, ул. Красноармейская, 40, каб. 619.**

Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Слоним, ул. Красноармейская, 40, каб. 621 в рабочие дни с 8.30 до 17.30. Телефоны для справок в Слониме: 8 01562 24611, 21534, 21641.

**Заявления принимаются по 30 июля 2010 года до 17.30 включительно.**

**e-mail: slonim-ispolkom@tut.by.** Адрес сайта: **http://slonim.grodnoregion.by**

## Вярнуцца ў Грундвальд праз 600 гадоў

### Першы канал прэзентуе прэм'еру дакументальнага серыяла пра Грундвальскую бітву

Беларускамоўны дакументальны серыял пад назвай «Grundwald» верне гледачоў у XV стагоддзе. Праект распавядзе пра тэрыторыю Вялікага Княства Літоўскага таго часу, становішча Каралеўства Польскага і Тэўтонскі ордэн. Серыял раскажа аб прычынах вайны, самой Грундвальскай бітве, апіша становішча бакоў, якія ўдзельнічалі ў канфлікце, і дасць характарыстыкі гістарычных асобаў.

Як патлумачыў карэспандэнту «Звязды» **аўтар сцэнарыя аглядальнік Агенцтва тэленавін Белтэлерадыёкампаніі Максім КАРОТКІН**, здымкі дакументальнага цыкла доўжыліся больш за год.

— Ідэя здымак лятала ў паветры — яшчэ год таму было зразумела, што 600-годдзе Грундвальскай бітвы будзе вялікай падзеяй. Таму здымаць пачалі яшчэ летась: аб'ехалі амаль усю Заходнюю Беларусь. Здымкі праходзілі таксама на Грундвальскім полі. Атрымаўся 5-серыйны цыкл, кожная серыя па 26 хвілін. Мова серыяла — беларуская.

Кансультантамі праекта выступілі вядучыя гісторыкі Беларусі Аляксандр Груша, Аляксандр Шаланда, Георгій Галенчанка і Юрый Бохан.

— Мы наўмысна не прыцягвалі да здымак польскіх і нямецкіх гісторыкаў, — працягвае Максім Кароткін. — Апошнім часам гісторыя Грундвальскай бітвы становіцца ўсё больш міфалагізаванай, а так як мы робім фільм пра Беларусь, то больш мэтазгодным мы палічылі дапамогу беларускіх гісторыкаў, а не замежных.

Рэжысёр фільма — Настасся Кужоўнік. Прэм'ера дакументальнага серыяла запланавана на 12 ліпеня. У дзённым эфіры Першага канала фільм будзе ісці да 18 ліпеня.

**Ілья ЛАПАТО.**

## ИЗВЕЩЕНИЕ ОБ ОТКАЗЕ ОТ ПРОВЕДЕНИЯ АУКЦИОНА

**ККУП «Витебский областной центр маркетинга» сообщает:**

**Лот № 1.** Земельный участок с кадастровым номером 240100000003006272 площадью 1,0935 га, расположенный по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Медицинская, для строительства объекта «Торговый центр по улице Медицинской в микрорайоне «Медцентр» в г. Витебске», срок аренды 25 лет, опубликованный для продажи права заключения договора аренды земельного участка в информационном сообщении о проведении открытого аукциона по продаже права заключения договоров аренды земельных участков, опубликованном в газете «Звязда» от 02 июня 2010 г. № 105 (26713), снимается с торгов согласно решению Витебского городского исполнительного комитета.

**Лот № 2.** Земельный участок с кадастровым номером 240100000003006276 площадью 0,1695 га, расположенный по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Медицинская, для строительства объекта «Продовольственный магазин в микрорайоне «Медцентр» в г. Витебске», срок аренды 25 лет, опубликованный для продажи права заключения договора аренды земельного участка в информационном сообщении о проведении открытого аукциона по продаже права заключения договоров аренды земельных участков, опубликованном в газете «Звязда» от 02 июня 2010 г. № 105 (26713), снимается с торгов согласно решению Витебского городского исполнительного комитета.

Сумма задатка, внесенная участниками аукциона на счет городского исполнительного комитета, подлежит возврату им в течение 5 рабочих дней со дня отказа местного исполнительного комитета от проведения аукциона.

Приносим свои извинения. Контактный тел: (0212) 47 97 35, e-mail: vcm74@mail.ru, vitinvest.biz.

## Крымінал

### АСУДЖАНЫ МАЦІ-ЗАБОЙЦЫ

Па восем гадоў турмы атрымалі маладыя жанчыны з Лунінецкага раёна за аналагічныя злачынствы. Адна з іх, 20-гадовая, ужо мае дачку трох гадоў. Замужам яна ніколі не была, а летась нарадзіла хлопчыка ў ванне, дзе і ўтапіла немаўля, а потым труп выкінула ў кустоўе за прысядзібным участкам. Але дзіця знайшлі суседзі і пазванілі ў міліцыю.

Як паведаміла памочнік пракурора Брэсцкай вобласці Вольга Дзмітрук, па другой справе праходзіла 27-гадовая жанчына. Яна замужам, з мужам гадуе паўтарагадовага сына, трохгадовую дачку, народжаную да замужжа, выхоўваюць яе бацькі. Сваю трэцюю дзяўчынку кабета пасля нараджэння кінула ў выграбную яму.

### СЫГРАЛА НА ПАЧУЦЦЯХ

У жыхаркі горада Белаазёрска пад следства трапіў муж, дырэктар аднаго з прадпрыемстваў. Да высвятлення абставінаў 55-гадовы мужчына ўзяты пад варту. І тут знаходзіцца «добразычліўка» з Брэста, якая доўга і старанна ўгаворвае жонку даць грошы і бярэцца ўладкаваць справу. Жанчына перадала махлярцы 22 тысячы долараў. Але брастаўчанка, завалодаўшы грашыма, знікла. І жанчыне нічога не засталося, як звярнуцца ў міліцыю. Махлярка затрымана.

**Яна СВЕТАВА.**

